прямо противоположные. Процесс восприятия предложенных анимационных программ зависит от многих факторов:

- возраста участников или зрителей;
- уровня образованности;
- пола;
- этнической принадлежности;
- настроения на момент реализации данной программы и т.д.

Именно поэтому важно дифференцировать потребителей данных услуг заранее, иметь в запасе несколько различных программ или мероприятий, чтобы удовлетворить разные вкусы. Кроме того, необходимо укрепление материально-технической базы анимационных служб на туристских предприятиях.

Для того чтобы анимационные программы были действительно интересными, необходимо их правильно организовать. Организаторская деятельность предполагает наличие у специалистов умения распределить работу, персонально определить обязанности, права и ответственность, устанавливать время выполнения работ, разрабатывать систему контроля за исполнением принимаемых решений, вести дела так, чтобы видеть и решать коренные вопросы в перспективе.

Организация призвана обеспечивать оптимальное взаимодействие всей анимационной команды, то есть согласованность, соподчинение и координацию всех ее структурных элементов. Организация анимационной деятельности как составная часть технологического процесса требует строгого соблюдения полной профессиональной самостоятельности всех специалистов и одновременно всемерного развития их активности и инициативы в рамках конкретных задач своих структурных подразделений.

Как правило, таких структурных подразделений несколько:

- организатор спортивно-оздоровительной деятельности;
- организатор развлекательных программ;
- организатор работы с детьми;
- организатор туристско -экскурсионной работы;
- менеджер анимационной службы, координирует работу всех отделов.

Качество анимационной программы связано, как правило, с интересными режиссерскими находками, богатым арсеналом сценографических, музыкальных, пластических, речевых, светотехнических приемов в разработке и реализации анимационных программ.

Характерными чертами современной анимационной деятельности являются высокий уровень культурно-технической оснащенности, использование современных анимационных технологий, форм и методов организации и высокий художественный уровень.

## ПАМЕЖНЫ ТУРЫЗМ: ШАНС ДЛЯ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ

*Люкевіч Ул.П., Брэсцкі дзяржаўны універсітэт*

Імклівыя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя падзеі, якія адбываліся на працягу апошніх дваццаці гадоў у Еўропе, вызначылі новыя акцэнты міжнароднага супрацоўніцтва. Сярод іх вылучаецца працэс утварэння еўрарэгіёнаў, якія

выконваюць важныя сацыяльна-гаспадарчыя функцыі ў сферы міжнародных узаемасувязяў некалькіх краінаў, што маюць агульную мяжу. Адно з такіх формаўтварэнняў паўстала дзесяць гадоў таму на беларуска-польска-украінскай мяжы як транспамежнае аб'яднанне пад назвай «Еўрарэгіён Буг», куды ўвайшлі Брэсцкая вобласць ад Беларусі, Люблінскае ваяводства ад Польшчы і Валынская вобласць ад Украіны. Гэтае транспамежнае аб'яднанне грунтуецца на гістарычных, геапалітычных, эканамічных і культурных падставах функцыянавання азначанага рэгіёну, што ўлічвае як рэтраспектыўныя, так перспектыўныя аспекты развіцця і супрацоўніцтва акрэсленых тэрыторый, што непасрэдна адносіцца і да турыстычнай галіны. Яшчэ адно аб'яднанне падобнага тыпу на Берасцейшчыне пад назвай Еўрарэгіён «Белавежская пушча» паўстала літаральна ў апошнія гады, і таксама мае велізарны турыстычна-пазнавальны патэнцыял.

Спецыфіка беларускіх тэрыторыяў у сферы турызму ў Еўрарэгіёнах «Буг» і «Белавежская пушча» мае свае адметнасці праз шэраг акалічнасцяў у параўнанні як з Польшчай, так і з Украінай. Перш за ўсё трэба звярнуць увагу на тое, што гэтыя землі непарыўна звязаны з польскай і украінскай культурай значнай колькасцю гістарычных падзеяў і славутых імёнаў. Гэта, напрыклад, Берасцейская унія 1596 года, месцы нараджэння апошняга польскага караля Станіслава Аўгуста Панятоўскага, Тадэвуша Касцюшкі, Рамуальда Траўгута, Адама Міцкевіча і г.д. Па-другое, да 1939 года Заходняя Беларусь, як і Заходняя Украіна, уваходзіла ў склад Польшчы, і да гэтага часу па абодва бакі Буга ў сучасным тэрытарыльна-палітычным утварэнні жывуць як беларусы і ўкраінцы, так і палякі.

Разам з тым нельга не звярнуць увагу на тое, што ў сваіх сацыяльна-гаспадарчых арыентацыях гэтыя суседскія краіны пайшлі ў розных напрамках. Польшча імкнецца далей інтэгравацца з міжнародным супольніцтвам на падставе рэалізацыі эканамічных ідэяў свабоднага рынку ў супрацоўніцтве з краінамі Еўрапейскага саюза. Украіна, у сваю чаргу, перажывае цяжкі перыяд змены сацыяльна-палітычных арыентацыяў. Тым не менш, на ўзроўні рэгіянальных сацыяльна-гаспадарчых сувязяў знаходзяцца шляхі да ўзаемапаразумення як праз сістэму асабістых узаемаадносінаў, так і на падставе дзейнасці разнастайных урадавых і недзяржаўных арганізацый. Хоць, трэба адзначыць, паміж Беларуссю і Польшчай ад кастрычніка 2003 года ўсталяваны візавы рэжым перасячэння дзяржаўнай мяжы, што па вялікім рахунку не спрыяе павелічэнню колькасці асобаў як з аднаго, так і з другога боку да візітаў.

Разам з тым можна зазначыць, што на беларускай тэрыторыі маюцца пэўныя перспектывы стварэння падставаў для развіцця турызму, і адпаведныя беларускія службы і структуры пачалі сур'ёзна ставіцца да транспамежнага супрацоўніцтва ў гэтай галіне. Разам з тым маецца шэраг бар'ераў сацыяльна-эканамічнага і палітычнага характару, якія на дадзеным этапе не даюць у поўнай меры раскрыць увесь той патэнцыял, які тут ўтрымліваецца. Аднак, трэба прыняць пад увагу, што працэс далейшага развіцця еўрапейскай інтэграцыі ў перспектыве робіць даволі рэалістычным становішча, калі Беларусь атрымае дывідэнты ад дзейнасці ў сферы турызму. А транспамежнае супрацоўніцтва на еўрарэгіянальным узроўні разглядаецца як адзін з крокаў у гэтым накірунку.